# НавінЫ

БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

нумар 4 (37)

14 лютага 2001 г.


# СЬПІС ПРЭТЭНДЭНТАЎ МОЖА СКАРАЦІЦЦА

***Фронт выступае за тое, каб імя адзінага кандыдата было названае найхутчэй***

***8 лютага ва Ўправе БНФ «Адраджэньне» прайшло чарговае паседжаньне Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сілаў, у працы якой прынялі ўдзел прадстаўнікі буйнейшых дэмакратычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў, прафсаюзных арганізацыяў.***



*Падчас паседжаньня КРДС, 8 лютага*

У беларускім дэмакратычным грамадзтве існуе чаканьне канчатковых рашэньняў Каардынацыйнай Рады: калі нарэшце будзе названае імя адзінага кандыдата? Фронтаўская дэлегацыя ў КРДС адстойвае чым хутчэйшае вызначэньне імя чалавека, якога мы, аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, падтрымаем. Ёсьць у нас і апаненты ў Каардынацыйнай Радзе, некаторыя зь якіх кажуць, што імя прэтэндэнта павінны назваць Кангрэс дэмакратычных сілаў, які адбыўся б праз тыдзень пасьля абвешчаньня выбараў (аднак такі варыянт абсалютна немагчымы, таму што ўжо праз 5 дзён пасьля абвешчаньня выбараў у Цэнтральную выбарчую камісію трэба падаваць сьпіс ініцыятыўнай групы, якая будзе зьбіраць подпісы за прэтэндэнта). Зразумела, што абвешчаньне імя прэтэндэнта стала б знакам еднасьці дэмакратычных сілаў і дазволіла б нарэшце паўнацэнна плянаваць пэрсанальную выбарчую кампанію такога чалавека.

Галоўнай тэмай паседжаньняў КРДС па-ранейшаму застаецца пытаньне вылучэньня адзінага дэмакратычнага кандыдата на прэзыдэнцкія выбары 2001 году. Так было і 8 лютага. Каб узгадніць некаторыя спрэчныя пазыцыі, сябры Кансультацыйнай Рады правялі закрытае паседжаньне. Пра вынікі размовы даволі аптымістычна распавёў старшыня БСДГ Станіслаў Шушкевіч: «На павестцы дня стаяла некалькі пытаньняў, сярод якіх – далейшыя кансультацыі па вылучэньні адзінага кандыдата на выбарах. Мне здаецца, мы маем шанец у самыя бліжэйшыя дні вылучыць такога чалавека. Мы абмяняліся думкамі, не было аніякіх супярэчнасьцяў. Адназначна магу сказаць, што стала больш паразуменьня. Патрабаваньні да патэнцыйнага прэзыдэнта вельмі простыя: ён павінен быць за незалежнасьць краіны, за прававую дзяржаву, за тое, каб у нас дзейнічала канстытуцыя, якая адпавядае мінімальным стандартам правоў чалавека і дэмакратыі».

Старшыня БНФ Вінцук Вячорка так пракамэнтаваў вынікі сустрэчы: «На аргкамітэце Кангрэсу дэмсілаў і на Каардынацыйнай Радзе пакуль што было пацьверджана (ніхто не аспрэчваў, не абверг), што тэрмінам правядзеньня Кангрэсу мог бы быць сакавік. Пакуль я з гэтага ўсьцешаны. На паседжаньні КРДС 8 лютага не было прынятае канчатковае рашэньне пра складаньне сьпісу прэтэндэнтаў, бюлетэню для галасаваньня на Кангрэсе: колькі ў ім будзе іменаў – тры, два. Можа быць, адно, – што б было най-

працяг на стар. 2

vytoki.net

# БНФ рыхтуецца да прэзыдэнцкай кампаніі

***10 лютага 2000 г. адбыўся чарговы Сойм БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ. У парадку дня былі арганізацыйныя пытаньні, а таксама пытаньне ўдзелу БНФ у выбарчай кампаніі. З дакладамі выступілі старшыня БНФ Вінцук Вячорка й намесьнікі старшыні Вячаслаў Сіўчык і Віктар Івашкевіч.***

Галоўнай тэмай Сойму стала падрыхтоўка Фронту да прэзыдэнцкай кампаніі. Была дэталёва абмеркаваная сытуацыя ў кааліцыі дэмакратычных сілаў; прайшла дыскусія наконт тэмпаў вызначэньня адзінага кандыдата. Выказваліся розныя пункты гледжаньня, але бальшыня ўдзельнікаў пагадзілася з тым, што цяперашняя сытуацыя дыктуе менавіта той тэмп вызначэньня кандыдата, які рэальна існуе. Сябры Фронту выказалі меркаваньне, што пасьпешлівыя крокі з вызначэньнем адзінага кандыдата ня будуць існаваць на карысьць адзінству кааліцыі.

«Сытуацыя з вызначэньнем адзінага кандыдата, – выказаў думку Вінцук Вячорка, – разьвіваецца натуральным чынам. Ужо ў сакавіку мы зможам выйсьці на Кангрэс Дэмакратычных Сілаў, які зацьвердзіць імя кандыдата, падтрыманага аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі. Круглы стол, ініцыяваны КРДС, які прайшоў 9 лютага, паказаў, што ўжо цяпер можна пачынаць супольную працу – прынамсі ў тых кірунках, якія не вымагаюць вызначэньня адзінага кандыдата».

Паліткамітэту БНФ было даручана сфармаваць сьпіс адказных па 15-і кірунках дзейнасьці, вызначанай у выбарчай кампаніі. Гэтыя людзі потым павінны ўвайсьці ў агульны кааліцыйны штаб. Быў праведзены функцыянальны падзел абавязкаў рэгіянальных актывістаў Фронту паводле асноўных кірункаў кампаніі.

Сябры Сойму ўхвалілі імкненьне кіраўніцтва БНФ і сябраў КРДС не замыкацца ў межах Каардынацыйнай Рады, а ствараць шырокае паразуменьне ўсіх дэмакратычных сілаў. Сойм вітаў імкненьне ўсіх грамадзкіх сілаў, у прыватнасьці, Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай, прадэманстраваць у бліжэйшы час свой пратэстны патэнцыял.

**Прэсавая група БНФ «Адраджэньне» й Партыі БНФ**

*Пачатак на стар.1*

# СЬПІС ПРЭТЭНДЭНТАЎ МОЖА СКАРАЦІЦЦА

лепш. Гэта павінна вызначыцца ў выніку кансультацыяў арганізацыяў-сябраў КРДС і ўласна прэтэндэнтаў».

Праз 4 дні пасьля паседжаньня Каардынацыйнай Рады, у панядзелак, 12 лютага, такія кансультацыі адбыліся з трыма прэтэндэнтамі. На патрабаваньне сп. Шушкевіча быў запрошаны яшчэ і сп. Павал Казлоўскі. Але факт удзелу сп. Казлоўскага ў кансультацыях, на думку кіраўніцтва Фронту, не павінен абазначаць ператварэньне тройкі ў чацьвёрку. «Я пярэчыў бы пераўтварэньню тройкі ў чацьвёрку, – сказаў «Навінам БНФ» Вінцук Вячорка. – Дай Божа, каб мы тройку ўтрымалі і зьменшылі, а не бясконца павялічвалі колькасьць прэтэндэнтаў. Прынцыпова важным ёсьць высьветліць, хто з прэтэндэнтаў мае намер працаваць камандна й ісьці на паразуменьне з Каардынацыйнай Радай і структурамі, што яе складаюць. З аднаго боку і прэтэндэнт павінны быць прахадным – г. зн. мець адпаведныя асабістыя якасьці, біяграфію, арганізацыйныя здольнасьці. Але з другога боку ён павінны абапірацца на дасьведчаныя, шматлюдныя, агульнабеларускія і ахвярныя структуры, якія яму павінны давяраць, а ён павінен давяраць такім структурам. Спалучэньне праходнасьці прэтэндэнта і эфэктыўнасьці структураў толькі й можа даць жаданы вынік. Калі ж прэтэндэнт не разьлічвае на падтрымку дэмакратычных сілаў, а зьбіраецца гуляць у сваю гульню, то ён засьведчвае такім чынам сваю няздольнасьць працаваць камандна й паводле ўзгодненага сцэнару. Пазыцыя Фронту акрэсьленая: такія прэтэндэнты не павінны разглядацца нагул у сьпісе для галасаваньня на Кангрэсе дэмакратычных сілаў».

Паводле вынікаў кансультацыяў можна ўжо цяпер зрабіць выснову, што прэтэндэнты па-рознаму ставяцца да КРДС і Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Адны практычна адкрытым тэкстам заяўляюць, што ня будуць зважаць на іхныя рашэньні, якія б яны ні былі, а іншыя , наадварот, выяўляюць гатоўнасць працаваць у камандзе і падпарадкоўвацца рашэньням Кангрэсу. Гэта і ёсьць вельмі добрай базай для прыняцьця канчатковых рашэньняў.

**Сяргей КАНДРАТОВІЧ**

# Круглы стол «Прэзыдэнцкія выбары – 2001»

У пятніцу, 9 лютага, прайшло паседжаньне Круглага стала «Прэзыдэнцкія выбары - 2001» Хоць на сустрэчы прысутнічалі ня ўсе запрошаныя, круглы стол атрымаўся даволі прадстаўнічым. Арганізатарам стаў прэзыдыюм Вярхоўнага Савету 13 скліканьня.



*Сямён Домаш, Мечыслаў Гіруць і Мечыслаў Грыб пад час круглага стала «Прэзыдэнцкія выбары - 2001».*

У дыскусіі наконт грамадзка-палітычнай сытуацыі ўзялі актыўны ўдзел незалежныя сацыёлягі. Актуальным бало пытаньне выхаду з канстытуцыйнай крызы і плян дзеяньня пасьля перамогі.

Нагода круглага стала аб'яднала шырокі палітычны спэктар: БНФ, АГП, фракцыя БСДП «За адзінства», прадстаўнікі «Яблока», аб'яднаньня «Выбар-2001», незалежныя сацыёлягі і палітолягі, прадстаўнікі беларускіх недзяржаўных арганізацыяў. Былі і патэнцыйныя кандыдаты ў прэзыдэнты – Міхаіл Чыгір і Сямён Домаш.

Удзельнікі круглага стала даручылі Каардынацыйнай Радзе дэмакратычных сілаў распрацаваць графік і плян далейшых сустрэчаў, якія адгэтуль будуць праводзіцца па меры неабходнасьці. Ужо сёньня вядомая тэма наступнага Круглага стала – арганізацыя працы на прэзыдэнцкіх выбарах, а таксама наладжваньне дыялёгу паміж рознымі дэмакратычнымі сіламі, арганізацыю якога возьме на сябе КРДС.

**М.С.**

vytoki.net

# Уладзімер КУДЗІНАЎ: «Знойдуцца людзі, якія скажуць праўду»

*Чалавек, які так і ня зьняў свой подпіс пад імпічмэнтам Лукашэнку, дэпутат Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, Уладзімер Кудзінаў 5 лютага быў выпушчаны на свабоду. І адразу, змабілізаваўшыся, актыўна увайшоў у палітычнае жыцьцё.*

8 лютага ва Ўправе БНФ прайшла прэсавая канфэрэнцыя, на якой спадар Ул. Кудзінаў падрабязна распавядаў пра жыцьцё «там», дзе таксама яго чакаў перасьлед уладаў: псыхалягічны – прымушалі рабіць працу, якая прыніжала ягоную годнасьць, фізычны – саджалі ў карцар, з-за чаго прыйшлося аб'явіць галадоўку. Адным словам, «сумаваць» там не было часу.

Пра Ул. Кудзінава падчас адбываньня тэрміну не забыліся ня толькі перасьледвальнікі, але і замежнікі, якія пастаянна падтрымлівалі вязьня. Ён сустракаўся са старшынём КНГ АБСЭ сп. Г.-Г. Вікам і ягоным намесьнікам сп. Г.П. Кляйнэрам.

І за кратамі дэпутат Вярхоўнага Савету 13 скліканьня не забываў назіраць за палітычнай сытуацыяй, сачыць за тымі, чый лёс ня склаўся дзякуючы існуючай уладзе. Але нягледзячы на ўвесь пэсымізм гэтага становішча, Уладзімер Кудзінаў верыць у тое, што «знойдуцца людзі, якія скажуць праўду», і той, хто вінаваты, будзе пакараны.

Уладзімер Кудзінаў, адседзеўшы 4 гады, ня страціў жаданьня любым законным шляхам здабываць для Беларусі свабоду й незалежнасьць – ён зьбіраецца працягваць сваю палітычную дзейнасьць, не зважаючы на атрыманае папярэджаньне, што «кожнае слова, кожны крок будуць пад кантролем у адпаведных структураў».

**Алёна ПАПЛАЎСКАЯ**





# НАШЫЯ ВУЧАЦЦА Ў СЭРБАЎ

## *Сэрбы распавялі пра навуковае забесьпячэньне грамадзкай кампаніі мабілізацыі людзей на выбары*

*Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў і Цэнтар Супольнасьць правялі Міжнародны калёквіюм «Самаарганізацыя грамадзянскай супольнасьці ў пераходны пэрыяд».*




У яго працы бралі ўдзел кіраўнікі й актывісты грамадзкіх арганізацыяў, партыяў і незалежных прафсаюзаў Беларусі, якія на працягу трох дзён спасьцігалі пераможны досьвед сваіх сэрбскіх калег: прадстаўнікоў кааліцыяў грамадзкіх арганізацыяў, маладзёвых згуртаваньняў, прафсаюзаў.

Даклад пра сытуацыю ў Беларусі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў зрабіў Вінцук Вячорка. Працавалі чатыры тэматычныя групы: «Вызначэньне мэтавых групаў і стратэгічнае пляніраваньне кампаніі» (беларускі і сэрбскі мадэратары – Сяргей Мацкевіч з Цэнтру Супольнасьць і Мая Джорджавіч з Цэнтру за дэмакратыю); «Праца з канкрэтнымі групамі ... пошук добраахвотнікаў для ўдзелу ў кампаніі» (мадэратары – Віктар Івашкевіч з Камітэту абароны рабочых і Весна Голіч з «Групы 484»); «Моладзевыя кампаніі» (мадэратары – Крысьціна Сідун з Задзіночаньня беларускіх студэнтаў і Слабадан Джынавіч з руху «Отпор»); «Арганізацыя назіраньня за выбарамі й паралельнага падліку галасоў» (мадэратары – Валянцін Стэфановіч з праваабарончага цэнтру «Вясна» і Зоран Лучыч з Цэнтру за свабодныя выбары й дэмакратыю CeSID).

Сэрбскія калегі распавялі пра навуковае забесьпячэньне грамадзкай кампаніі мабілізацыі людзей на выбары, асабліваасьці арганізацыйнае працы, у тым ліку ў рэгіёнах, прадэманстравалі беларусам шматлікія ды разнастайныя ўзоры друкаванай прадукцыі, маек, іншых вырабаў, што распаўсюджваліся падчас кампаніі выбараў, а таксама відэакліпы. Удзельнікі дамовіліся аб працягу беларуска-сэрбскай супрацы ў гэтай галіне.

**А. Ш.**

vytoki.net

# УКРАіНА: СХЕМЫ і СКАНДАЛЫ



*Адна з найбуйнейшых краінаў Эўропы аказалася зацягнутай у сэнсацыйны скандал, наступствамі якога могуць стаць спыненьне рэформаў, пагроза страты незалежнасьці краіны й вяртаньня на расейскую палітычную арбіту.*

Незалежна ад таго, ляжыць праўда на паверхні або яна далёка захаваная, у любым выпадку падзеі разгортваюцца эфэктна й скандальна. Самая шчырая й грубая вэрсыя магла б гучаць так: украінскі прэзыдэнт і яго топ-чыноўнікі па сваёй сутнасьці брыдкамоўныя бандзюгі, якія разам распрацоўваюць плян ліквідацыі надакучлівага журналіста. Целаахоўнік запісвае на стужку іхныя размовы, уцякае за мяжу, а пасьля рэшткі інфармацыі прасочваюцца ў стан апазыцыі. Улады спрабуюць вытрымаць гэты ўдар шляхам прыдушэньня кволых рэформаў, і, у абмен на падтрымку, дамовіцца з Расеяй наконт сыстэмы транзыту энэрганосьбітаў.

Такая вось просьценькая вэрсыя падзеяў апошніх некалькіх месяцаў. Натуральна, яна ня ўсім даспадобы. Для тых, хто любіць «смачненькае», існуе іншае тлумачэньне, даволі папулярнае ва ўкраінскіх палітычных колах: за ўсёй валтузьнёй хаваецца або нейкая замежная краіна – Расея, ЗША ці Ізраіль, або якісьці магнат, або палітычны апанэнт ці іхная група – гэта ўжо каму што болей падабаецца. А забойства, запіс размоваў на стужку ці падробка гэтай самай стужкі ня што іншае, як спробы запэцкаць незаплямленае імя прэзыдэнта і адсунуць яго ад улады.

Справа ня жарт, бо Ўкраіна краіна не маленькая, хаця і не такая моцная. Пасьля Расеі Ўкраіна са сваімі 52 мільёнамі насельніцтва – другая краіна ўсходнеэўрапейскага рэгіёну. Калі яна будзе круціцца на Крамлёўскай арбіце, як Беларусь і іншыя экс-савецкія рэспублікі, то Расея зноўку верне сабе статус супэрдзяржавы, прынамсі, ў рэгіёне. Паводле іншага сцэнару, Украіна замацоўвае сваю незалежнасьць, інстытут дэмакратыі й рынкавую эканоміку, што дасьць Эўрапейскаму Зьвязу (і НАТА – назло Расеі) магутнага і стабільнага ўсходняга суседа, які да таго ж будзе служыць узорам для Расеі. У параўнаньні з банкруцтвам, ростам злачыннасьці і тысячамі нелегальных імігрантаў пры ўмове развіцьця па першым шляху.

У мінулым годзе прыкметы перамяшаліся. З аднаго боку, Кучма надта ўжо моцна пасябраваў з Пуціным. Расейскія кампаніі ўрвалі самыя прыбытковыя, самыя «тлустыя» кавалкі украінскае эканомікі па халяўных коштах. А ўрад і Прэзыдэнт на гэта заплюшчваюць вочы. Дадайце сюды разгул карупцыі і рахманасьць і паслухмянасьць прэсы – вось вам і карціна.

Але ня ўсё так дрэнна. Украіна пасьпяхова і па-майстэрску правяла перамовы па замежных запазычанасьцях, выгандляваўшы сабе пэўныя ільготы, зьнізіла штогадовы паказчык інфляцыі з 377% 5 год таму да 20% паводле апошняга падліку. Рост эканамічных паказчыкаў склаў 6% у мінулым годзе, што зьдзівіла ўсіх зацікаўленых суб'ектаў, у тым ліку і МВФ (якія прагназавалі 2%). Сапраўды, краіна разьвіваецца амаль такімі ж тэмпамі, як і Расея (7% за мінулы год), нягледзячы на больш складаныя ўмовы – свой энэргарэсурс вельмі абмежаваны, і бальшасьць энэргіі паступае якраз з Расеі. Ну і, нарэшце, калі ў 1998 годзе расейскі рубель загрымеў на 75 адсоткаў і адправіў усю расейскую эканоміку ў глыбокі накаўт, грыўна толькі крыху здала свае пазыцыі.

Увесь скандал круціцца вакол трох фактаў. Першы – гэта зьнікненьне ў верасьні Георгія Гангадзэ, чыё зьнявечанае цела было знойдзена крыху пазьней.

Другі: былы супрацоўнік прэзыдэнцкай службы аховы Мікалай Мельнічэнка прадставіў запісы галасоў вельмі падобных да галасоў Кучмы і некаторых іншых украінскіх чыноўнікаў самага высокага рангу, дзе тыя вельмі насычанай і каларытнай мовай абмяркоўвалі магчымыя спосабы вырашэньня сваіх праблемаў, у прыватнасьці – ліквідацыі Гангадзэ.

Трэці: і без таго вельмі дрэнныя адносіны паміж адміністрацыяй прэзыдэнта і ўрадам рэзка абвастрыліся. Віцэ-прэм'ер Юлія Цімашэнка абвінавачваецца ў кантрабандзе, падробцы дакумэнтаў і махлярстве з падаткамі. Усе абвінавачваньні каранямі ідуць у яе былую дзейнасьць у газавай прамысловасьці, якую яна зараз рэфармуе. Астатнія ўрадоўцы таксама знаходзяцца пад прэсінгам. Так, міністар замежных справаў сышоў у адстаўку, а прэм'ер-міністар Віктар Ючшанка, якога на Захадзе разглядаюць ня менш як надзею краіны, увесь час адчувае на сабе напады з боку палітычнага працаўніка. Між іншым Кучма правярнуў з Пуціным справу, у выніку якой для расейскіх кампаніяў стала лягчэй прыбраць да рук украінскія энэргакампаніі.

Што насамрэч адбываецца і як паміж сабою зьвязаныя гэтыя тры сагі (калі ўвогуле зьвязаныя) дагэтуль невядома. Чаму забілі Гангадзэ? Ён быў не такім ужо і важкім журналістам. Чаму менавіта гэтая справа выклікала сапраўдны фурор, калі журналістаў забіваюць ледзь ня кожны месяц? Ці зьяўляюцца сапраўднымі стужкі, ці гэта падробкі, або падкарэктаваныя вэрсіі сапраўдныя размовы? Хто запісаў (або падрабіў) іх? Навошта? Хто дапамог Мельнічэнку ўцячы? Ці былі абвінавачваньні высунутыя супраць Цімашэнкі, таму што яна надта далёка залезла у справы карумпаваных магнатаў, набліжаных да адміністрацыі прэзыдэнта, на чым яна і настойвае? А можа зь якой іншае прычыны?

А вось што падобна на казку, дык гэта тое, што просты целаахоўнік здолеў запісаць сотні гадзінаў канфідэнцыяльных




*Удзельнік акцыі пратэсту «Украіна бяз Кучмы» трымае плякат у цэнтры Кіеву, сьнежань 2000 г.*

размоваў. Ды як запісаць – пакласьці запісвальную прыладу (дыктафон) пад канапу. Мельнічэнка сьцьвярджае, што ён зрабіў гэта. Заходнія структуры таксама наўрад ці палезьлі б у такую завярушку, хаця некаторыя ўкраінцы вераць, што Амэрыка хоча замяніць Кучму на Ючшанку. Пра гэта можа сьведчыць факт, што украінскамоўная служба Радыё «Свабода», якая фінансуецца амэрыканскім урадам, была варожа настроеная апошнім часам у адносінах да Кучмы і давала шмат этэрнага часу Мельнічэнку. Самай праўдападобнай вэрсіяй выглядае запіс стужкі для нутраного карыстаньня. Проста нехта пасьля скраў або купіў гэтую стужку.

працяг на стар. 5



vytoki.net

# БУШ ВЫКОНВАЕ АБЯЦАНЬНІ



*43-і Прэзыдэнт ЗША Джордж Буш, які афіцыйна заняў гэтую пасаду 20 студзеня, адразу пачаў выконваць свае перадвыбарчыя абяцаньні.*

Як вядома, адным з ключавых момантаў кандыдацкае праграмы Буша было «зьмяншэньне падатковага ціску» на ўсе слаі амэрыканскага грамадзтва. І ўжо на пачатку лютага да адпраўкі ў Кангрэс быў падрыхтаваны прэзыдэнцкі плян паніжэньня падаткаў. Асноўныя палажэньні гэтага пляну Джордж Буш пракамэнтаваў у сваім радыёзвароце да нацыі.

На думку Прэзыдэнта, вялікая колькасьць амэрыканцаў адчуваюць сябе сёньня «заціснутымі». Яны працуюць па 40-60 гадзінаў на тыдзень, і ім яшчэ выпадае аплочваць шматлікія рахункі. Напрыканцы доўгага тыдню яны зьбіраюць усе свае рахункі разам і становіцца відавочна, што агульная сума падаткаў, якую атрымлівае фэдэральны ўрад, почасту зьяўляецца, на думку Буша, «несправядлівай». Далей ён прыводзіць прыклад, які дэманструе недасканаласьць існуючай падатковай сыстэмы. Так, калі жанчына-адвакат зарабляе 250 000 даляраў штогод , а афіцыянтка – 25 000 даляраў, і яны абедзьве атрымліваюць павышэньне заробнае платы, менавіта афіцыянтка вымушаная будзе істотна павялічыць пералічэньні ў бюджэт паводле найвышэйшай скрайняй падатковай стаўкі. Ёй прыйдзецца вяртаць амаль што палову ўсёй дадаткова атрыманай сумы.

Буш прапануе замест вялікай колькасьці падаткаў увесьці адзін. Ён сьвярджае, што ягоны плян «скарачае падаткі для кожнага, хто плаціць падаткі». Фактычна ніжэйшая стаўка падаходнага падатку зьніжаецца зь 15 да 10 адсоткаў. Максымальная стаўка скарачаецца да 33 %, паколькі новы Прэзыдэнт ЗША «перакананы, што ніхто ня мусіць сплочваць фэдэральнаму ўраду больш чым трэцюю частку сваіх даходаў». Паводле разьлікаў эканамістаў, сярэднестатыстычная сям'я з 4 чалавек зможа вярнуць прыкладна 1600 даляраў са сваіх грошай, калі прэзыдэнцкі плян будзе зацьверджаны Кангрэсам ЗША.

Буш разумее, што трэба сплочваць нацыянальныя даўгі, і ўважае гэтую праблему актуальнай і істотнай. Ён сьцьвярджае, што ўрад будзе гэты доўг сплочваць. Разам з тым ён ведае, што, паводле ягонага выразу, «амэрыканскія сем'і таксама маюць пазыкі, якія трэба сплочваць». Буш спадзяецца, што зьмяншэньне падаткаў будзе стымуляваць эканоміку й спрыяць стварэньню новых працоўных месцаў.

Асноўнай вартасьцю свайго пляну Прэзыдэнт лічыць тое, што ён адчыняе дзьверы ў сярэднюю клясу мільёнам амэрыканцаў.

«Краіна квітнела й узбагачалася цягам больш чым 20 апошніх гадоў. Але шмат людзей адчувалі, нібыта яны назіралі ўвесь гэты час праз акно за чыёйсьці вечарынай. Прыйшоў час разбурыць дзьверы, адчыніць вокны й запрасіць кожнага ўвайсьці. Час узнагародзіць працу тых людзей, хто імкнецца ўвайсьці ў сярэднюю клясу й пакласьці ў іхныя скрыні болей грошай у той час, калі ім гэта патрэбна», – такімі словамі завяршае свой зварот да нацыі новы Прэзыдэнт.

Натуральна, зьмяншэньне падаткаў цягне за сабой скарачэньне даходнай часткі бюджэту й, адпаведна, дзяржаўных выдаткаў, у тым ліку й на сацыяльныя патрэбы. Але большасьць амэрыканцаў вельмі станоўча ставіцца да пляну Буша ў галіне падаткаабкладаньня. І невыпадкова, што Буш пачаў свае рэформы менавіта з такіх папулярных у грамадзтве крокаў – поствыбарчыя пералікі й судовыя разьбіральніцтвы пакінулі шмат незадаволеных і пацягнулі за сабой пэўны дэфіцыт даверу да ўсіх галінаў улады й да новаабранага Прэзыдэнта ў прыватнасьці. Каб «закрыць» тэму выбараў, Бушу патрэбныя хуткія, рашучыя, яскравыя й папулярныя дзеяньні. Тым ня менш, зьмяншэньне падаткаў ёсьць адной з галоўных умоваў далейшых эканамічных рэформаў, запланаваных Бушам і агучаных у перадвыбарчай праграме. Так што новы плян падаткаабкладаньня, прадстаўлены ў Кангрэс, сьведчыць аб вернасьці Прэзыдэнта сваім словам і рашучасьці ягоных намераў. Выбаршчыкі, што аддалі свае галасы Бушу, могуць быць задаволеныя – ён выконвае свае абяцаньні.

**Аляксей ЯНУКЕВІЧ,**
**сябра Сойму БНФ**

*Пачатак на стар.4*

# УКРАіНА: СХЕМЫ І СКАНДАЛЫ

У любым выпадку скандал пахіснуў пазыцыі Кучмы і ягонай каманды. Але не ўтаптаў яго ў бруд. СМІ, у большасьці кантраляваныя прапрэзыдэнцкімі магнатамі, паставілі пад сумнеў і стужкі, і матывы людзей, што іх выкарыстоўвалі.

Але Мельнічэнка можа вынесьці на публіку яшчэ колькі стужак. А там запісаныя прамыя і яскравыя доказы карумпаванасьці на самым высокім ўзроўні. Хаця Кучма, былы дырэктар прадпрыемства, здаецца, мае моцны страўнік на такія прысмакі. Адзін з клянаў вакол ягонай адміністрацыі можа скарыстаць момант і выжыць супернікаў, або ўвогуле паставіць на верх свайго чалавека. Рэфармісты й украінскія сябры на захадзе спадзяюцца, што ў рэшце рэшт Ючшанка стане прэзыдэнтам. Гэты скандал можа згуляць яму на руку або папярэдзіць пра магчымае пагаршэньне сытуацыі.



*Акцыя пратэсту «Украіна бяз Кучмы» у цэнтры Львову, студзень 2001 г.*

Усё гэта нагадвае стан рэчаў у суседняй Беларусі, дзе за апошнія пяць год больш-менш дэмакратычная палітычная сыстэма была зьнішчаная прэзыдэнтам-параноікам і ягонымі магутнымі прыхільнікамі, шмат хто зь якіх трымаюць сталую сувязь з Крамлём.

**The Economist**
**Пераклаў з ангельскай Андрэй САРОТНІК**


vytoki.net

# ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

## *Віншаваньне беларускай моладзі*

Мы, моладзь Беларусі, віншуем вас з Днём Валянціна, сьвятам шчасьлівых, маладых і закаханых. У гэты дзень, шмат стагодзьдзяў таму, ў часы Рымскай імперыі хрысьціянскі сьвятар Валянцін, які таемна вянчаў закаханых, ахвяраваў сваім жыцьцём у імя любові – і з гэтага моманту 14 лютага юнакі і дзяўчаты адзначаюць па ўсім сьвеце.

Дзень сьвятога Валянціна для сёньняшняй Беларусі – гэта яркі і пранізлівы сымбаль (вобраз), які нагадвае нам і пра эўрапейскія традыцыі, і пра рамантызм маладосьці, і пра любоў як неверагодную сілу. У наш час цемры й бруду, хлусьні й агрэсіі, уціску й дыктату так важна не забывацца, што ў рэшце рэшт толькі ЛЮБОЎ перамагае й пераадольвае любое зло. Толькі моцнай любові магчыма узьняць цяперашнюю Беларусь. Любоў да роднай краіны, мовы й звычаяў, любоў да сваёй эўрапейскай спадчыны, любоў да кожнага суайчыньніка, бліжняга свайго, і, нарэшце, любоў у найвышэйшым сэнсе , любоў Божая – вось у чым выключны сэнс і значэньне даты 14 лютага.

Вось ужо пяты год у гэты дзень беларуская моладзь праводзіць масавыя сьвяткаваньні пад бел-чырвона-белымі сьцягамі «Беларусь – у Эўропу!». У 1996 г. шматтысячнае шэсьце, арганізаванае Маладым Фронтам у Менску, прайшло па пяці заходніх амбасадах: дэлегатаў студэнцкае вуліцы віталі на дыпламатычным узроўні. У 1998 г., паралельна зімовай алімпіядзе ў Нагана, адбыўся Алімпійскі карнавал, калі віншаваньні ў замежныя прадстаўніцтвы перадавалі спартовыя каманды. У 1999 г. дэманстрацыя 14 лютага завяршылася грандыёзным фаервэркам піратэхнікі (за што адзін з арганізатараў і заяўнік сёлетняй акцыі, Яўген Скочка, быў асуджаны на год турмы ўмоўна). Леташняя «Акцыя любові», у якой удзельнічала больш за 2000 маладых людзей у Менску і яшчэ некалькі тысячаў у рэгіёнах, прайшла ў дванаццаці найбуйнейшых гарадах Беларусі без адзінага затрыманьня.




Моладзь перамагае ЛЮБОЎЮ. І якія б перашкоды не стаялі на нашым шляху – незаконная ўлада ці былая імпэрыя, страх ці гвалт, хлусьня ці нянавісьць – мы поўныя рашучасьці дамагчыся шчасьця ў будучыні для Беларусі менавіта ЛЮБОЎЮ. І акцыі 14 лютага сьведчаць: на вачах нараджаецца новая Беларусь – краіна веры, надзеі і свабоды, краіна, якая імкнецца насустрач эўрапейскае цывілізацыі і адкрытаму грамадзтву.

У гэты дзень аб'яднаньне найбуйнейшых беларускіх маладзёвых арганізацыяў – кааліцыя «Пераменаў!» – праводзіць кампанію «Любові! Свабоды! Пераменаў!» па ўсёй краіне. З самае раніцы такія «валянцінкі», як і вы, атрымаюць нашыя бацькі, суседзі і сябры. Віншавальныя звароты перадаюцца ў 18 амбасадаў – прадстаўніцтвы эўрапейскіх краінаў і ЗША, ААН і АБСЭ пад лёзунгам «Беларусь – у Эўропу!». А ўвечары ў 32-х найбуйнейшых гарадах Беларусі пройдуць сьвяточныя мерапрыемствы – шэсьці й канцэрты, дыскатэкі й вечарыны, вэрнісажы графіці і арыгінальныя імпрэзы.

Мы верым у тое, што новая эра пачынаецца для Беларусі зь ЛЮБОВІ. Мы больш ня хочам трываць прыніжэньня, абыякавасьці, злосьці і саўковага рабства. Мы больш ня хочам жыць на руінах Імпэрыі зла, у зняўбанай правіцы, пад прыгнётам дыктатуры. Мы выступаем за Новую Беларусь, новы лад жыцьця і новага прэзыдэнта! Мы выбіраем ЛЮБОЎ, СВАБОДУ і ПЕРАМЕНЫ. 2001 год : адлік пачаўся нанова. У новым тысячагодзьдзі ад нараджэньня Хрыста новае пакаленьне гаворыць на ўвесь голас – так, каб чулі ўсе:

ЛЮБОВІ! СВАБОДЫ! ПЕРАМЕНАЎ!

# МАЛАДЫ ФРОНТ ЗЬБІРАЕЦЦА ЗАСУДЗІЦЬ МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ

5 лютага Малады Фронт падаў апэляцыю ў Вярхоўны Суд з прычыны адмовы Міністэрствам юстыцыі ў рэгістрацыі. Нагадаем, што прыгоды Маладога Фронту пачаліся яшчэ 16 траўня 2000 г, калі былі пададзены дакумэнты на рэгістрацыю МГА «Малады Фронт». Міністэрства юстыцыі зацягвала вынясеньне рашэньня па справе МФ аж да 3 студзеня 2001г.

У зыскавай заяве Маладога Фронту зьвяртаецца ўвага на неадпаведнасьць рашэньня Мінюсту дзеючаму заканадаўству. Падставы, на якіх было адмоўлена ў рэгістрацыі, проста сьмешныя: сяброўства ў арганізацыі фізычных асобаў замест «членства», форма падачы аб'явы ў газэту і г. д. Малады Фронт патрабуе скасаваць рашэньне Міністэрства юстыцыі і чакае ад Вярхоўнага Суду вэрдыкту аб неабходнасьці рэгістрацыі МГА «Малады Фронт»

«Мы ня маем ніякіх ілюзіяў адносна рашэньня суду, – заявіў з гэтай нагоды старшыня Маладога Фронту Павал Севярынец. – Улады панічна баяцца распачатай намі шырокамаштабнай кампаніі па вываду беларускай моладзі на прэзыдэнцкія выбары, і таму ня могуць дазволіць легалізацыі самага буйнога і ўплывовага маладзёвага руху».

**Прэс служба Маладога Фронту**

vytoki.net

# Стварэньне новага штабу ў межах Менскай абласной КРДС

***На ўстаноўчым сходзе Менскай абласной Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў было вырашана стварыць Менскі абласны штаб па правядзеньні выбараў.***

Сустаршынямі былі абраныя Валянцін Баранаў (БНФ) і Пятро Голасаў (АГП). Валянцін Баранаў заявіў, што яны настроеныя каардынаваць усе дзеяньні, фармаваць адну узгодненую пазыцыю: «Мы спадзяёмся, што максымальна якасна будзе зроблена праца на карысьць паляпшэньня палітычнай, эканамічнай сытуацыі й дэмакратычнага працэсу».

У Менскую абласную КРДС уваходзіць 7 арганізацыяў: БНФ «Адраджэньне», Партыя БНФ, АГП, БСДП (НГ), БСДГ, СПБ, а таксама прадстаўнікі Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў. Старшыня Менскага абласнога штабу па правядзеньні выбараў сп. Валянцін Баранаў заявіў, што гэта не канчатковы склад арганізацыяў: «Мы адкрытыя і для іншых партыяў, якія падтрымліваюць нашыя погляды».

На паседжаньні разглядаліся актуальныя для Менскай вобласьці грамадзка-палітычныя пытаньні, а таксама пэрспэктывы прэзыдэнцкіх выбараў.

# Ворша за Домаша

***10 лютага адбыўся сход прадстаўнікоў 9 дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Воршы.***

На сходзе было прынятае рашэньне зьвярнуцца да КРДС Беларусі з заклікам падтрымаць кандыдатуру Сямёна Домаша ў якасьці адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. Для інфармацыйнай падтрымкі гэтай ідэі створаная ініцыятыўная група, якую ўзначаліў старшыня Цэнтру «Крывічы» Алесь Шутаў. Аршанскія дэмакраты не сумняваюцца, што неўзабаве КРДС прыйдзе да пагадненьня й Домаш будзе названы адзіным кандыдатам у Прэзыдэнты Беларусі ад усяго дэмакратычнага блёку. У сувязі з гэтым яны плянуюць зьвярнуцца да іншых грамадзкіх і палітычных сілаў рэгіёну з заклікам аказаць падтрымку Сямёну Домашу як будучаму кандыдату ў Прэзыдэнты.

# «Берасьцейская грамадзянская вунія-2001»

***3 лютага ў Берасьці адбыўся сход па ўтварэньні кааліцыі «Берасьцейская грамадзянская вунія – 2001».***

Ініцыятарамі акцыі сталі цэнтар «Вежа», мясцовая філія БНФ, шэраг іншых грамадзкіх арганізацыяў гораду. На сустрэчы з грамадзкасьцю прысутнічаў Сямён Домаш, які на дадзены момант узначальвае Савет па каардынацыйнай дзейнасьці дэмакратычных рэгіянальных аб'яднаньняў. Паводле сьведчаньняў арганізатараў, заля Дому культуры Беларускага таварыства глухіх, дзе адбывалася сустрэча, была запоўненая цалкам. На працягу некалькіх гадзінаў праходзіла актыўнае абмеркаваньне, што склалася ў краіне. Напрыканцы імпрэзы быў прыняты зварот:

Мы, удзельнікі сходу па ўтварэньні «Берасьцейскай грамадзянскай вуніі-2001», заяўляем, што наша краіна Рэспубліка Беларусь перажывае адзін з самых складаных і драматычных пэрыядаў сваёй гісторыі: на мяжы распаду эканоміка й духоўная культура краіны. У заняпадзе мэдыцына й адукацыя. Зьнікае мова народу. Гіпэрінфляцыя й шалёны рост цэнаў паверглі народ у стан фізычнага выжываньня. У ціскак крызысу, без жыцьцёвай пэрспэктывы задыхаецца маладое пакаленьне. Катастрафічнымі тэмпамі растуць злачыннасьць, п'янства, наркаманія. Перапынены дыялёг уладаў з апазыцыяй і ўсялякі пошук разумнага выйсьця з крызысу. Дзейны прэзыдэнт і выканаўчая вэртыкаль трымаюцца за ўладу любым коштам, навязваюць грамадзтву сілавыя сцэнары разьвязаньня існуючых праблемаў, ужываючы запалохваньні, рэпрэсіі й неканстытуцыйныя мэтады кіраваньня. На нашых вачах уласная краіна становіцца для мільёнаў людзей мачыхай-чужаніцай.

Усьведамляючы адказнасьць за лёс і будучыню народу, мы заўляем: грамадзтва расчараванае курсам і вынікамі сямігадовага знаходжаньня ва ўладзе дзеючага прэзыдэнта й ягонай адміністрацыі. Грамадзтва стамілася ад нянавісьці, хлусьні й канфліктаў, ад нішчымніцы й духоўнага жабрацтва. Людзі жадаюць нармальнага чалавечага жыцьця, дабрабыту, стваральнай працы пад аховай разумных і справядлівых законаў. Нам патрэбная ясная й зразумелая пэрспэктыва ўласнага жыцьця й жыцьця краіны. Грамадзтва высьпела для ПЕРАМЕНАЎ, грамадзтва патрабуе ПЕРАМЕНАЎ.

Свае надзеі людзі ўскладаюць на выбары новага Прэзыдэнта краіны, які здолеў бы выявіць волю народу да духоўных пераўтварэньняў, сацыяльных і эканамічных рэформаў, зрабіць Беларусь квітнеючай і заможнай эўрапейскай краінай, паважным і адказным сябрам міжнароднай супольнасьці.

Заяўляючы аб утварэньні кааліцыі «Берасьцейская грамадзянская вунія-2001», мы выказваемся ў падтрымку пераменаў і заклікаем усіх грамадзянаў, палітычныя партыі, грамадзкія, прафсаюзныя, творчыя арганізацыі Берасьця й іншых рэгіёнаў краіны аб'яднаць нашыя сілы й намаганьні ў мэтах стварэньня грамадзкіх гарантыяў правядзеньня свабодных і справядлівых выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, якія б адпавядалі міжнародным прававым стандартам і садзейнічалі рэалізацыі неад'емнага канстытуцыйнага права грамадзянаў на свабодны, незалежны выбар.

1. Мы лічым, што выбары Прэзыдэнта павінны стаць крокам да грамадзянскай згоды й кансалідацыі ўсіх грамадзка-палітычных сілаў краіны на глебе дакладнага й бясспрэчнага выкананьня ўсімі бакамі й удзельнікамі выбарчага працэсу Канстытуцыі РБ і нормаў міжнароднага права.

2. Мы патрабуем спыненьня ў СМІ кампаніяў палітычнага шальмаваньня й перасьледу палітычных апанэнтаў, стварэньня роўных умоваў для кандыдатаў, правядзеньня агітацыйнай выбарчай кампаніі, роўнага доступу для дзяржаўных СМІ.

3. Мы заклікаем зацікаўленыя бакі адмовіцца ад усякіх спробаў неканстытуцыйнага ўмяшальніцтва ў выбарчы працэс, выкарыстаньня брудных выбарчых тэхналёгіяў і аказаньня любога ціску на кандыдатаў, працу выбарчых камісіяў і волевыяўленьне грамадзянаў.

4. Мы перакананыя, што свабодныя й справядлівыя выбары мажлівыя толькі пры эфэктыўным кантролі грамадзтва, забесьпячэньні рэальнага ўдзелу грамадзянаў у кіраваньні краінай праз працу выбарчых камісіяў у якасьці назіральнікаў, як таго патрабуе Канстытуцыя і Выбарчы кодэкс РБ.

5. Мы заяўляем, што будзем публічна агалошваць ўсе факты парушэньня заканадаўства аб выбарах, а пры неабходнасьці патрабаваць крымінальнага суду над вінаватымі. У новае стагодзьдзе мы павінны ўвайсьці як цывілізаваны эўрапейскі народ, здольны вырашаць усе пытаньні жыцьця краіны на аснове закону, нацыянальнага кансэнсусу й свабоднага волевыяўленьня грамадзянаў.

Зварот адкрыты для свабоднага падпісаньня грамадзянаў.

Подпіс пад дакумэнтам азначае, што падпісанты падзяляюць мэты кааліцыі й бяруць на сябе маральны абавязак садзейнічаць усімі даступнымі ім канстытуцыйнымі сродкамі правядзеньню ў краіне свабодных і справядлівых выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з уваходжаньнем у кааліцыю «Берасьцейская грамадзянская вунія-2001», зьвяртацца па кантактным тэлефоне ў Берасьці: 20-34-92.

**Настасься Герасімовіч**

# ВОЛЬНЫ БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ СЬЦЯЖОК БЕЛАРУСІ

Зважай, Беларус! Ідучы на кожную акцыю (мітынг, шэсьце й г.д.) ты мусіш мець з сабою гэты сродак барацьбы за Бацькаўшчыну, але яго можна й нават трэба выкарыстоўваць штодня й усюды!

Як зрабіць сьцяжок:




Памеры сьцяжка могуць быць вольныя, але ня дужа вялікія.

Прыклад расходаў матэрыялаў на сьцяжок:

– белая стужка (пры шырыні 5,5-6 см) - 20 см;

– чырвоная стужка згібаецца вакол белай папалам і яе трэба будзе 40 см (пры шырыні 2-2,5 см). Шырыня белай і чырвонай стужак залежыць ад віду стужак, якія прадаюцца ў галянтарэйных крамах;

– нітка -120 см (лепей шоўкавая ці сынтэтычная, яна прасоўваецца па лініі згібу чырвонай стужкі й зьвязваецца вузельчыкам да грузіка);

– грузік - любы ( дыямэтрам 1-1,5 см), яго лёгка зрабіць з мяккага дроту (камяк) абмазанага плястылінам ці, папросту, гайка або шайба невялікіх памераў.

Чырвоная стужка счапляецца ніткамі да белай стужкі ўручную, ці на швачнай машынке, альбо прыклейваецца. Таксама магчыма й вашае вольнае выкананьне сьцяжка.



Самы лепшы час для масавага закідваньня бел-чырвона-белых сьцяжкоў на дрэвы ў Дзень Незалежнасці – 25 сакавіка, але гэта можна рабіць і ў іншыя нацыянальныя сьвяты. У сакавіку лісьце яшчэ не распусьцілася і сьцяжкі на дрэвах бачныя здалёку. Сьцяжкі закідваюцца на дрэвы па ходу шэсьця, на месцы, дзе праходзіць мітынг, альбо ў мясцовасьці, дзе чалавек жыве, што надае прыкметнасьць гэтаму сьвяту, адлюстроўвае яго вялікую сьвяточнасьць, дый застаецца пасьля акцыі на доўгі час.

Упершыню гэтыя сьцяжкі былі выкарыстаныя ў Менску на сьвяце 25 сакавіка 1999 году. Я раскідаў па дрэвах па ходу шэсьцьця ад пляцу Якуба Коласа да скверу Янкі Купалы каля 50 такіх сьцяжкоў.



**Жыве Вольная і Незалежная Беларусь!**

**Алесь КАМЛІНСКІ**

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ**

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12 Sprava H 15

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

________________________
(прозьвішча)

________________________
(імя)

________________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «____» ____________ 19___ г**

**жыве па адрасе:** ____________________
(індэкс і поўны адрас)

________________________

**род заняткаў:** ____________________

**тэл.** ____________________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

____________ (дата)    ____________ (подпіс)

НавінЫ
БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»
№ 4 (37), 14 лютага 2001 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нутра[...]

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42 , тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін
У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia



vytoki.net